*Вячаслаў Калацэй*

# ДА ПЫТАННЯ ГІСТОРЫІ ЭТНАКУЛЬТУРНАГА ВЫХАВАННЯ Ў ПОСТФАЛЬКЛОРНЫХ АСЯРОДКАХ БЕЛАРУСІ (мяжа XX-XXI стагоддзяў)

Беларусь – краіна з багатай гісторыяй і самабытнай культурай. Развіццё фалькларыстыкі дало магчымасць даследаваць, сабраць, накапіць і сістэматызаваць матэрыял па духоўнай спадчыне Беларусі вялікага сацыяльна-культурнага значэння, які сёння ўяўляе сабой каштоўны пласт ведаў. І дзеля таго, каб Беларусь існавала як унітарная дзяржава з трывалымі перспектывамі, каштоўнасці фальклору неабходна засвойваць не толькі навукоўцам і студэнтам, але, у абавязковым парадку, дзецям.

Паколькі механізмы «натуральнай» перадачы традыцыі на мяжы XX-XXI стагоддзяў відавочна «буксуюць», шмат для захавання і развіцця культуры могуць зрабіць педагогі, якія паслядоўна і сістэмна працуюць з дзецьмі і моладзю. Таму менавіта ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі (былым Рэспубліканскім палацы піянераў) былі зроблены адныя з першых на Беларусі крокаў па шляху эстэтычнага выхавання дзяцей з урбанізаванага асяроддзя сродкамі фальклору. У вакальна-харэаграфічным піянерскім калектыве пад кіраўніцтвам Анатоля Дзмітрука падрыхтоўчую групу з 1963 вяла студэнтка і неўзабаве – выпускніца музычнай вучэльні і Мінскай кансерваторыі Маргарыта Іванова. Тое, што ў якасці дыдактычнага матэрыялу яна з другой паловы 1970-х гадоў выкарыстоўвала прыпеўкі, песні і гульні з выдадзенай Галінай Барташэвіч кнігі «Беларускі дзіцячы фальклор» дазволіла ёй адасобіцца ва ўласнае звяно калектыва і стварыць ансамбль «Зорачка».

Як не дзіўна, своеасаблівым «каталізатарам» гэтага працэсу з'явіўся «Ансамбль Дзмітрыя Пакроўскага». У канцы 1970-х гадоў некалькі супрацоўнікаў Палаца піянераў (дырэктар Алена Дзмітрыева, завуч Вольга Кляцова, педагог Маргарыта Іванова) наведалі яго канцэрт у Касцёле Святых Сымона і Алены (у тыя часы – будынак Беларускага задзіночання кінематаграфістаў), у якім удзельнічала і дзіцячая група пры калектыве Пакроўскага. Трэба ўлічыць, што дзіцячых фальклорных ансамбляў на Беларусі ў тыя часы проста не існавала. Эфект навізны, што быў памножаны на талент і майстэрства выканаўцаў, выклікаў цэлую плыню захаплення. Шмат хто з прысутных хваліў выступ, абяцаў стварыць нешта падобнае ў нас. Іванова засяроджана маўчала, але ў 1980 годзе мела ўжо першую праграму, створаную на падмурку фальклорных дзіцячых песень, гульняў і танцаў. Быў утвораны калектыў з таленавітых педагогаў (Ала Навіцкая, Мая Канішчава, Марыя Аксёнава, Уладзімір Каральчук, Лідзія Пазнова, Яўген Трыгубовіч), з якім ансамбль падрыхтаваў некалькі праграм, складзеных на аснове беларускай музыкі і харэаграфіі, наведаў некалькі кантынентаў, даў вялікую колькасць канцэртаў.

Іх творчы пачатак віталі Генадзь Цітовіч і Віктар Роўда. Калектыў «Зорачкі» супрацоўнічаў з доктарам філалагічных навук Галінай Барташэвіч, выдатным музыкам і дырыжорам, прафесарам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міхасём Дрынеўскім, рэжысёрам Віктарам Шэвелевічам, харэографамі Валянцінай Гаявой і Васілём Варановічам, мастакамі па касцюму Вольгай Дзёмкінай і Юрыем Піскуном, майстрамі Алесем Жукоўскім, Уладзімірам Кульпіным і Уладзімірам Пузыням. Зараз ансамблем, што адзначыў у 2003 годзе 40-годдзе, кіруе Ала Навіцкая, педагогамі ў «Зорачцы» ўжо працуюць яе былыя выхаванцы.

Мінск – не адзіны горад, дзе сёння існуюць дзіцячыя фальклорныя калектывы пры ўстановах культуры і адукацыі. Працэс пашырэння фальклорнага руху ў дзіцячым асяродку закрануў сёння ўсе рэгіёны Беларусі. Гэта стварыла ўмовы для існавання шэрагу рэспубліканскіх праектаў па этнакультурным выхаванні. Як правіла, распачаты яны былі ў 1990-я гады, але моц і размах набылі на пачатку XXI стагоддзя.

Эфект масавага і якаснага далучэння да народнай творчасці дзяцей меў Рэспубліканскі эксперыментальны праект «Танцавальны фальклор і дзеці» (праводзіўся ў 2001 годзе), які праз гурткі і школьныя заняткі з мінімальнымі фінансавымі ўкладаннямі хутка прывабіў да заняткаў фальклорам 2700 навучэнцаў [2, с. 6]. Дзякуючы намаганням аўтара праекта Міколы Козенкі вакол вопытных носьбітаў народнай рэгіянальнай традыцыі ўзніклі і «акрэплі» выдатныя дзіцячыя фальклорна-этнаграфічныя калектывы (мал. 1): «Берагіня» (Барысаўскі раён, кіраўнікі Мікола Козенка і Антаніна Абрамовіч), «Рудабельскія зорачкі» (Акцябрскі раён, кіраўнік Вольга Дульская), «Нежачкі» (Расонскі раён, кіраўнік Валянціна Ліцвінава), у праекце бяруць удзел «Верабейкі» (Любань, кіраўнік Сяргей Выскварка), «Калыханка» і «Куманёк» (Мінскі раён, кіраўнік Ларыса Рыжкова).

Зараз на Беларусі працуе шмат спецыялістаў у галіне этнапедагогікі, выхавання дзяцей сродкамі народнай культуры. Досвед некалькіх дзесяцігоддзяў дазваляе ім пры жаданні ўлічыць недахопы дзейнасці сваіх калег-папярэднікаў і падкарэціраваць падыходы да агульнай справы, пазбегнуць некаторых памылак і дасягнуць пэўных вартых увагі поспехаў. Асноўны арыенцір для выхаваўчага працэсу, якому актыўна спрыяюць большасць з іх – а ў т э н т ы ч н ы фальклор.

Такая работа мае месца як ва ўмовах горада, так і ў «натуральных» для фальклору вясковых асяродках. У Акцябрскім, Барысаўскім, Любанскім, Расонскім, Чачэрскім раёнах сёння існуюць дзіцячыя фальклорна-этнаграфічныя гурты, удзельнікі якіх пераймаюць мастацкія праявы традыцыйнай культуры сваіх мікрарэгіёнаў непасрэдна ад сталых носьбітаў аўтэнтычнага фальклору. Ля вытокаў іх станаўлення прыкладзена дзейнасць такіх таленавітых і самаадданых людзей, як этнахарэограф Мікола Козенка, этнамузыколаг Тамара Варфаламеева, гісторык і фалькларыст Таццяна Кухаронак. Дзейнасць установаў, што бяруць на сябе асноўны цяжар этнакультурна-выхаваўчых памкненняў, сёння відавочна пачынае выліваццаў мэтанакіраваную працу ў шэрагу кірункаў.

Асноўным з іх з'яўляюцца заняткі пабытавым танцам, спеўным, размоўным, інструментальным фальклорам, традыцыйным дэкаратыўна-пабытавым мастацтвам сваёй мясцовасці ў працэсе падрыхтоўкі да фестываляў «Берагіня» [1, с. 14-19]. Акрамя гэтага, рэспубліка мае досвед правядзення змен этнакультурнага выхавання, досвед працы спецыялізаваных класаў у этнашколах, фальклорных летнікаў, фестываляў, майстар-класаў, «круглых сталоў», фальклорных школ. Кола іх удзельнікаў і арганізатараў павялічваецца і, згодна з аб'ектыўнымі абставінамі, неўзабаве колькасць не можа не перайсці ў якасць.

Цікавы, даволі працяглы (каля пятнаццаці гадоў), хаця і не адназначны, вопыт мае сацыяльна-педагагічны праект «Этнашкола» [4], якім было ахоплена каля 50 школ Беларусі. Гэта – добра спланаваны і змадэляваны тэрміновы праект, апошні этап якога доўжыўся з 2001 па 2006 гады. Зараз этнашколы пераведзены ў ведамства мясцовых упраўленняў адукацыі і раённых адміністрацый, якія вырашаюць прыярытэтныя пытанні арганізацыі ў іх навучальнага працэсу.



*Малюнак 1* – Фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Рудабельскія зорачкі»

ПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У лабараторыі народных мастацкіх рамёстваў і фальклору ўстановы адукацыі «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі» рэалізавалася ідэя рэспубліканскіх змен этнакультурнага выхавання, якія ў 2002 – 2004 гг. тройчы збіралі ў Нацыянальным дзіцячым аздараўленчым летніку «Зубраня» дзяцей-актывістаў фальклорнага руху краіны [3, с. 22]. Пасля гэтага этнакультурныя змены сталі праводзіцца адміністрацыяй летніка без далучэння спецыялістаў, і добрая справа, фактычна, «муціравала». Лабараторыя, сумесна з факультэтам традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, двойчы на год (з 2002 года) праводзіла «круглыя сталы» і майстар-класы па асвятленні праблем этнакультурнага выхавання ў краіне.

З 2006 года распачаты новы цікавы праект па этнакультурным выхаванні – сезонныя Рэспубліканскія фальклорныя школы. Яны адбываюцца ў рэчышчы выканання задання па інструментальнай этнафоніі галіновай праграмы «Захаванне і развіццё культуры ў Рэспубліцы Беларусь да 2010г.». Менавіта ў межах задання № 6 гэтай праграмы двойчы на год, з 2006 г. па 2009-ты, ладзіліся фальклорныя школы для : а) дзяцей і моладзі краіны, якія трапілі ў арбіту этнакультурнага выхавання; б) зацікаўленых у камунікацыі спецыялістаў па фальклоры.

Увогуле, да становчай складовай працэсу этнакультурнага выхавання трэба аднесці тое, што гэтая дзейнасць сёння праходзіць пры кансультацыях і актыўнай дапамозе лепшых у краіне, шырока вядомых па-за яе межамі навукоўцаў-фалькларыстаў Тамары Варфаламеевай, Міколы Козенка, Галіны Барташэвіч, Таццяны Кухаронак, Вольгі Лабачэўскай, Алены Боганевай, Уладзіміра Конана, Вольгі Шарай, Ірыны Мазюк, Таццяны Валодзінай, Арсеня Ліса.

Найбольш дасведчаныя і ініцыраваныя традыцыяй даследчыкі сёння апраўдана бачаць у працы з дзецьмі і моладдзю шанец дзеля захавання фальклору як сімвала культуры, вакол якога канцэнтруецца жыццесцвярджальная энергія этнасу. Этнолаг Леў Гумілёў, з апорай на другі закон тэрмадынамікі, даказаў, што без апошняй народ не здольны да трансляцыі ў часе не толькі як адмысловая этнічная адзінка, аднак і як аўтаномны соцыум з доўгачасовай стабільнай перспектывай існавання.

## Спіс літаратуры:

1. Берагіня: Шосты Рэсп. фестываль фальклорнага мастацтва : III Рэсп. турнір салістаў-выканаўцаў твораў народнай спадчыны / укл. М. Козенка. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2010. – 99 с.
2. Козенка, М. Аб выніках рэалізацыі Рэспубліканскага эксперыментальнага праекта «Танцавальны фальклор і дзеці» // Традыцыйная культура і дзеці / укл. М. Козенка. – Мінск : БедДІПК, 2004. – вып.1. – С. 56–70.
3. Пладунова, Т. Рухомы фэст «Па святах «Сонечнага крыжа»: сацыяльны запыт і канцэпцыя / Т.Пладунова // Штудыі Рэспубл. сезоннай фальклор. школы / рэд. кал. В. Калацэй (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – С. 22–27.
4. «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад.і навук. рэд. праф. І.І. Сучкоў. – Мінск : Бестпринт, 2004. – 99 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ